*2.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронны рэсурс] : 20 ліп. 2016 г., № 413-З: прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобраны Саветам Рэсп. Беларусь 30 чэрв. 2016 г. // ЭТАЛОН. Законодательство Респ. Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2018.

*3.* Культура Беларуси : 20 лет развития (1991–2011) : моногр. / С. П. Винокурова [и др.] ; под общ. ред. О. А. Галкина, И. Г. Голубевой. – Минск : Ин-т культуры Беларуси, 2012. – 332 с. : ил.

*4. Смаргович, И. Л.* Основы культурно-досуговой деятельности : учеб.-метод. пособие / И. Л. Смаргович ; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2013. – 174 с.

## ВАЕННАЯ ТЭМАТЫКА Ў ТВОРЧАСЦІ РУСКІХ І БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ

***М. В. Шуліка****, магістр мастацтвазнаўства, старшы выкладчык Белгарадскага дзяржаўнага інстытута мастацтваў і культуры*

Вайна… Як шмат можна пачуць у гэтым слове... Боль, страх, выбухі, стогны, ляск фашысцкіх ботаў, гул турбін самалёта... Сёлета Беларусь святкуе 75-годдзе вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Беларускі народ у гады Вялікай Айчыннай вайны панёс самыя страшныя страты – сотні спаленых вёсак, дзясяткі тысяч загубленых у канцлагерах. З 9200 населеных пунктаў знішчана ў гады Вялікай Айчыннай вайны больш за 5295: Жудасную долю Хатыні раздзялілі Бобылі, Росіца, Азарцы, Любажанка і безліч іншых вёсак, усе жыхары якіх былі знішчаны, разам з груднымі дзяцьмі і старымі.

Гэта не магло не знайсці свайго адлюстравання ў творчасці мастакоў, пісьменнікаў, паэтаў.

Адзін з вялікіх майстроў, чые працы адлюстроўваюць усе нягоды ваеннага часу, – Міхаіл Савіцкі. Юнацтва мастака прыйшлося на гады Вялікай Айчыннай вайны. У канцы 1941 года ён прымае ўдзел у баях за Севастопаль. Амаль адразу ж пасля нападу фашысцкіх войскаў на СССР будучы мастак трапляе ў палон, прайшоў канцлагеры Дзю-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сельдорфа, Бухенвальда. У 1945 годзе быў вызвалены з канцлагера ў Дахау. Гэтыя падзеі чырвонай ніткай праходзяць праз усю творчасць Міхаіла Андрэевіча.

З вялікай колькасці палотнаў мастака асабліваe трапятанне выклікае карціна «Партызанская мадонна», напісаная ў 1967 годзе. Аўтар пераносіць гледача ў тыя змрочныя гады, калі беларуская зямля стагнала ад фашысцкай навалы. Мастак паказвае патрыятызм і стойкасць свайго народа. У цэнтр карціны ён змяшчае жанчыну, якая корміць сваё дзіця. Вобраз маладой маці ўвасабляе надзею на мірнае жыццё, дабрабыт і хуткае заканчэнне вайны, непахіснасць беларускага народа.

Уся кампазіцыя карціны праглядаецца па двух дыяганалях, якія пранізваюць цэнтральны вобраз. Першая дыяганаль – гэта жаночыя вобразы, перамога жыцця над смерцю і прыгнётам.

Вакол галоўнага персанажа аўтар размяшчае некалькі груп людзей – у ніжнім правым куце мастак прапісвае яшчэ адзін жаночы вобраз. Гэта немаладая жанчына, якая сядзіць у скрусе, у гэтым вобразе засяроджана боль усяго беларускага народа; у верхнім левым куце размешчана група жанчын, якія збіраюць ураджай з поля. Аўтар наўмысна не паказвае нам асобы дадзенай групы людзей, тым самым як бы кажучы, што мірнае жыццё наперадзе, але якое, яно пакуль невядома.

Другая дыяганаль прасочваецца праз мужчынскія вобразы. Так, у ніжнім левым куце мастак адлюстроўвае партызана, які сядзіць на кані. Галава мужчына злёгку павернута на цэнтральны вобраз, ён пільна ўглядаецца назад, як быццам спрабуючы абараніць. Аб гэтым ускосна нагадваюць і размешчаныя вінтоўкі. У верхнім правым куце мастак размяшчае групу партызан, якія ідуць на палі бітвы. Міхаіл Андрэевіч таксама не паказвае нам іх асоб.

Усе персанажы на карціне напісаны ў карычневазямлістых танах, чорнае панурае неба паказвае на разбурэнне, нанесенае ворагам. Выкарыстанне дадзенага колеру ў карціне сведчыць пра гора, якое закранула кожную бела-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рускую сям'ю. У светлай каляровай гаме Міхаіл Андрэевіч піша вобраз маці. Светлая, амаль белая кашуля сімвалізуе святло, чысціню, мір і справядлівасць. Чырвоная хустка на яе плячах, сімвалізуе агонь і кроў, пралітую беларускім народам у гады Вялікай Айчыннай вайны. Карціна выклікала шырокі розгалас у грамадстве і была набыта Траццякоўскай галерэяй.

У 1974 годзе мастак прыступае да стварэння серыі карцін «Лічбы на сэрцы». Адна з карцін гэтай серыі – «Уцёкі». У аснове сюжэта ляжаць рэальныя падзеі, перажытыя аўтарам. Адны вязні караскаюцца ўверх па дошках, перакінутых праз правады пад токам, іншыя – падаюць, расстраляныя з дазорных вышак. Пры позірку на карціну нібыта чуюцца стогны людзей, выявы якіх размешчаны ў ніжняй частцы карціны, у вязня ў ніжнім правым куце – у вачах непрыхаваная надзея. Яго постаць мастак піша свабодна, паказваючы стойкасць. Рукі паднятыя ўверх, але не ў малебным жэсце, гэта свайго роду імкненне да працягу руху наперад. Крыху вышэй за гэту фігуру аўтар адлюстроўвае змардаванае цела, якое нагадвае шкілета. Галава пакорліва нахіленая, рукі цягнуцца ўверх, аднак хударлявыя пальцы не чапляюцца за калючы дрот. Ён спрабуе здзейсніць уцёкі, але сілы на зыходзе. На яго левым плячы мастак размяшчае нагу яшчэ аднаго вязня, які дакараскаўся да верху калючага дроту, і яму застаўся апошні рывок на волю...

Нароўні з беларускімі мастакамі тэма Вялікай Айчыннай вайны апявалася і рускімі мастакамі. Адзін з іх – Канстанцін Аляксеевіч Васільеў.

У 1973 годзе мастак піша карціну «Нашэсце». Палатно апавядае аб першых хвілінах уварвання фашысцкіх войскаў на тэрыторыю Радзімы. Гледача ахоплівае пачуццё неверагоднай трывогі. Па дыяганалі мастак размяшчае нямецкіх салдат, іх асобы сур'ёзныя, на іх тварах адсутнічаюць якія-небудзь эмоцыі, менавіта гэта выклікае адчуванне немінучай бяды.

Паралельна з варожай арміяй мастак адлюстроўвае свайго роду шчыт, здольны абараніць Радзіму, гэта хоць і раз-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

бураныя сцены праваслаўнага храма, але яны аказваюць велізарную маральную падтрымку. На тых фрагментах, якія захаваліся цэлымі, мастак адлюстроўвае вобраз Архангела Гаўрыіла і Святых айцоў Царквы. На не зусім яшчэ абрынутай сцяне відаць вялікі абраз святых, якія глядзяць услед салдатам і моляцца за народ, які падвергнуўся такім пакутам. У кантраснасці двух гэтых падзей відаць, што дзе б ні прайшоў вораг, там заўсёды руіны, гібель і слёзы.

Неба закрываюць цёмныя хмары, адзіным светлым момантам можна лічыць кавалачак чыстага неба, ён як праменьчык надзеі зіхаціць удалечыні, але і яго хутка пакрые цемра. Карціна напісана ў халодных аднатонных колерах – шэра-белых і сініх. Шэры колер – гэта колер смутку і суму ў жыцці цэлай краіны таго часу.

Аналізуючы карціны, напісаныя мастакамі ў розны час, можна адзначыць, што ўсе творы выклікаюць разнастайныя пачуцці – боль, горыч страты, шкадаванне загубленага жыцця, нянавісць да захопнікаў, але толькі не пачуццё страху.

## ТРАДИЦИОННАЯ МЕДИЦИНА В СОВРЕМЕННОЙ КУЛЬТУРЕ: МЕЖДУ НАУКОЙ, ИСКУССТВОМ И РЕЛИГИЕЙ

***В. П. Щербаков****, доктор философских наук, доцент,*
*профессор Санкт-Петербургского научно-исследовательского*
*института фтизиопульмонологии*
*Министерства здравоохранения Российской Федерации*

Определить место, значение и функции традиционной медицины в современном мире модернистской культуры, возникшем в результате научно-технической революции и утверждения идеалов научной рациональности, довольно непросто. На первый взгляд, после долгих десятилетий отрицания традиционных ценностей для нее совершенно не осталось места. Однако в реальности все не так просто. Как известно, уже в начале XX века идеалы Просвещения подвергаются серьезной переоценке и сомнению, а во второй



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ